**ДЗЯРАЖНЯ** – вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце, за 12 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай ст. Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 172 км ад Магілёва, на р. Дзяражня (прыток р. Бесядзь). Побач аўтадарога Краснаполле – Хоцімск.

Археалагічны помнік - курганны могільнік, які размешчаны за 2 км на паўднёвы ўсход, сведчыць, што гэтая мясцовасць заселена людзьмі ў далёкай старажытнасці.

Старажытная вёска вядома з 1777 г. як вёска пры р. Дзяражня, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Па рэвізіі 1816 г. вёска, 8 двароў, 66 сялянскіх душ, належала памешчыку Івану Шамбіяну. Па рэвізскіх матэрыялах 1850 г.116 жыхароў, уладанне памешчыка А.І. Камара. У 1852 г. у маёнтку памешчык Альфонс Комар заснаваў суканавальню, даход з якой складаў 200 руб. На 1880 г. вёска, 27 двароў, 237 жыхароў, у Студзянецкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся карчма, вадзяны млын. Побач з вёскай праходзіла вялікая дарога. Сяляне спалучалі земляробства з кравецкім і кавальскім промысламі. У 1896 г. была пабудавана драўляная праваслаўная Архістраціга-Міхайлаўская царква, прыход якой аб’ядноўваў 1707 прыхаджан. Царкве належала 33 дзес. зямлі. Паводле перапісу 1897 г. 33 двары, вадзяны млын, карчма, царква, у Студзянецкай воласці Чэрыкаўскага павета.

На пачатку 20 ст. сяло – цэнтр сельскагаспадарчай грамады, якая мела ў карыстанні 333 дзес. зямлі. Адкрыта народнае вучылішча (у 1907 г. 30 вучняў).

У 1909 г. 30 двароў, 238 жыхароў, казённая вінная крама, меўся млын.

У 1923 г. вясковыя дзеці наведвалі школу за 0,5 км у в. Красніца, у 1924 г. тут навучалася 10 дзяцей з в. Дзяражня. З 20.08.1924 г. вёска ў Красніцкім сельскім Савеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. У 1926 г. 63 двары, 327 жыхароў. Працавалі вятрак, сукнавальня, вадзяны млын, скураная майстэрня, кузня. У 1929 г. створаны калгас “Сталінскі прызыў”. З 03.05.1931 г. вёска – цэнтр Дзяражненскага сельскага Савета. Паводле перапісу 1959 г. – 336, у 1970 г. – 290 жыхароў. У 1986 г. вёска была ў складзе саўгаса “Печанеж”. Працавалі Дзяражненскае лясніцтва, 8-гадовая школа, бібліятэка, Дом Культуры, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі. Крывалінейная вуліца забудавана двухбакова індывідуальнымі драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. У цэнтральнай частцы вёскі сярод жылой забудовы размяшчаліся грамадскія будынкі.

У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС жыхары (231 сям'я) перaселены ў чыстыя мясцовасці. 1 гаспадарка, 1жыхар (2007 г.). Ліквідавана 20.03.2012 г.